**Праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, часопіса «Маладосць»**

# Вага ўзятых абавязкаў

***Да дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі***

**З чаго пачаць? Гэта ж як Нотр-Дам або Саграда Фамілія, як фларэнтыйская Санта Марыя дэль Фьёрэ — немагчыма змясціць цалкам у адзін пагляд, немагчыма ўзяць агульным планам. Толькі хадзіць наўкола, прыглядацца да дэталяў, стаяць гадзінамі ля калоны ці брамы, а потым складаць у адно, уяўляць цалкам і не стамляцца дзівіцца моцы і непераможнасці чалавечага духу , які стварае неспасцігальнае. З чаго ж пачаць…**

*Ганна Севярынец*

Ну, напрыклад, з гісторыі пра лістоўніцу.

Калі Дубоўку арыштавалі трэці раз, у 1949-м, і далі ўжо не турэмны ці лагерны тэрмін, як папярэднім разам, а ўсяго толькі вечнае пасяленне ў Краснаярскім краі, яны з жонкай прыехалі ў Почат, пасёлачак на беразе хуткаплыннай халоднай ракі Бірусы. Дубоўка ўладкаваўся працаваць цесляром, а Марыля Пятроўна — настаўніцай. Далі ёй з гэтай нагоды зямлю для будоўлі дома — дзялянку некранутай тайгі на беразе Бірусы. Уласнымі рукамі саракасямігадовы Дубоўка, за плячыма якога было дзевятнаццаць гадоў высылак, турмаў і лагера, пакарчаваў тайгу, разбіў агарод і паставіў дом.

Дык вось, падчас будоўлі неяк вынесла на супрацьлеглы бераг Бірусы таўшчэзную лістоўніцу. І Дубоўка паплыў на чоўне за ёй. Пераплыў раку, прымацаваў дрэва да лодкі — і рушыў назад.

А Біруса — вельмі хуткая рака.

## Адзіны ў свеце выпадак — калі пасля 28 гадоў маўчання літаратар вярнуўся ў жывы літаратурны працэс, і не ганаровым пенсіянерам, што перавыдае свае маладыя тэксты, а форвардам

Адным словам, калі Марыля Пятроўна спахапілася і выбегла на бераг паглядзець, дзе ж гаспадар, ані чоўна, ані чалавека ўжо не было. Яна бегала па беразе да самай ночы, гукала свайго бядовага Валодзю, падняла ўвесь Почат, і пачатаўцы, якія любілі гэтую шляхетную пару, таксама бегалі па беразе і гукалі Уладзіміра Мікалаевіча, але адказу ім не было. А калі ў цемры Марыля Пятроўна вярнулася дадому ў поўным адчаі, то ўбачыла ў вокнах святло.

Аказваецца, плынь пацягнула дрэва з чоўнам і чалавек не даў рады рачной моцы. Лодку знесла далёка ўніз: несла, пакуль лістоўніца не зачапілася за нейкія камяні. Там Дубоўка выбраўся з чоўна, зацягнуў і яго, і дрэва на бераг, пераплыў Бірусу і пакуль што пайшоў дадому. А з раніцы, адпачыўшы і набраўшыся сіл, вярнуўся, сеў у човен, абцяжараны дрэвам, і падняўся ўверх па рацэ да свайго дома з гэтай клятай, але цяпер ужо пераможанай лістоўніцай.

* * *

«Вага ўзятых абавязкаў». Пра гэтую вагу яшчэ ў 1927 годзе напісала Уладзіміру Дубоўку ў прыватным лісце Наста Нарутавічанка. Ну як напісала… Дубоўка, канешне, прыдумаў яе, тую Насту, прыдумаў і яе ліст, вакол якога закручаны сюжэт паэмы «Кругі» — адной з найлепшых Дубоўкавых паэм. «Спытаюся: ці думалі калі вы пра вагу

ўзятых абавязкаў?» — звяртаецца Нарутавічанка да маладога паэта, які вырашыў перабудаваць сусвет («Мы жыццё дашчэнту перайначваем, перайначым жа яго хутчэй!» — горача ўсклікае лірычны герой «Кругоў»). Напэўна, менавіта яна, вага ўзятых на сябе абавязкаў, і абумовіла колькасць і цяжар тых пякельных кругоў вакол уласных узвышшаў, якія давялося прайсці ў жыцці бліскучаму беларускаму паэту Уладзіміру Дубоўку.

Ён нарадзіўся… Дарэчы, і гэта цікавая гісторыя — калі нарадзіўся Уладзімір Дубоўка. Дзякуючы нядаўняму адкрыццю даследчыцы Наталлі Казапалянскай, якая адшукала ў архіве яго метрыкі, мы ўжо дакладна ведаем, што ён нарадзіўся 2 ліпеня (15-га па новым стылі) 1901 года. Між тым сваёй уласнаю рукой ва ўсіх вядомых дакументах — анкетах, спісах, паказаннях — Уладзімір Дубоўка пазначаў годам нараджэння 1900-ы. Гэты ж год і сёння стаіць ва ўсіх даведніках і падручніках, па ім жа адзначаюцца юбілейныя даты. Хутчэй за ўсё, падмена адбылася тады, калі малога Уладзіка аддавалі ў Манькавіцкую школу: не па гадах разумнага і рослага хлопчыка запісалі на год старэйшым, каб пасадзіць у клас. Уважлівы чытач Дубоўкавых аўтабіяграфічных тэкстаў мог здагадацца аб гэтым без метрык: «Між іншым, мяне паслалі ў школу тады, калі мне было няпоўных шэсць год («Каб дома не дурэў!»). Я ўжо добра чытаў. З гэтае прычыны настаўнік пасадзіў мяне не ў першы клас, дзе вучыліся дзеці 8-9 год, а ў так званы падрыхтоўчы. У гэтым класе былі выключна дзецюкі-навабранцы і дзяўчаты-нявесты, якім трэба было навучыцца распісвацца ды ліст які невялічкі напісаць. /…/ У гэтай школе я вучыўся пяць год (год у падрыхтоўчым, тры — у нармальных, і яшчэ адзін год — у чацвёртым, новаадкрытым)» — піша ён у нарысе «Сярод людзей добрых». Просты падлік гадоў, праведзеных у школе, і супастаўленне іх з іншымі біяграфічнымі звесткамі сапраўды нараджалі пытанні, бо гады не сыходзіліся. Але хто ж мог насамрэч падазраваць у падмане, няхай і бязвінным, самога Дубоўку?

Так і пайшоў ён па жыцці — беручы на сябе абавязкі не па ўзросце.

У Манькавіцкай школе Уладзік правучыўся сем гадоў. Але не толькі школай засталіся ў ім Манькавічы. Тады, на пачатку XX стагоддзя, ціхія і занядбаныя сёння Манькавічы былі вялікім і шумным маёнткам Друцкіх-Любецкіх, знакамітага магнацкага роду, прыбліжанага да імператарскага двара. Гаспадар

Сям'я Дубоўкаў. Уладзік стаіць, самы высокі. 1914 год.
З фондаў БДАМЛіМ



**«Узвышша» з траўня 1929 года пачынае выходзіць з выкарыстаннем новых літар беларускага алфавіта, створаных Дубоўкам: ён замяніў афрыкаты «дж» і «дз» адмысловымі знакамі, каб падкрэсліць самабытнасць і першараднасць фанетычных беларускіх з'яў у нашай графічнай сістэме**

Манькавіч, князь Уладзімір, стала жыў у Пецярбургу, займаў высокія дзяржаўныя пасады і кожны год быў запрошаны на імяніны да цара. У Манькавічах ён жыў некалькі летніх месяцаў, увесь астатні час палац стаяў пусты. Туды праз акно і лазіў малы Дубоўка ў багатую княжацкую бібліятэку. Хаваўся там у шыкоўных фатэлях — і чытаў. Бацька Уладзіка, Мікалай Фёдаравіч, працуючы на бровары Друцкага-Любецкага, моцна траўміраваў руку, спрабаваў дабіцца ад князя дапамогі і кампенсацыі, але дзе там — і таму кінуў маёнтак і сышоў рабочым на чыгунку.

Сваіх дзяцей Мікалай і Настасся Дубоўкі зацята вучылі — усе яны ў выніку мелі вышэйшую адукацыю. Адразу пасля заканчэння Манькавіцкай школы Уладзіка аддалі ў Мядзельскую двухгадовую вучэльню, а потым паслалі вучыцца ў Новую Вільню, у настаўніцкую семінарыю. Пачыналася Першая сусветная вайна, дабірацца да ваколіц Вільні было цяжка, цывільным шляхам — па квітках у камфортных вагонах — амаль немагчыма, і бацька-чыгуначнік саджаў сына на вузенькую пляцоўку паміж вагонамі, ля счэпу, а каб не зваліўся пад колы, моцна прывязваў да парэнчаў. У 1915 годзе Дубоўкі эвакуіраваліся ў Маскву — чыгуначнікаў вывозілі сем'ямі, а настаўніцкая семінарыя была пераведзена ў Невель. Толькі ў 1918-м сямнаццацігадовы Уладзік самым неверагодным чынам прабраўся праз рэвалюцыйна-ваенную навалу ў Маскву, адшукаў там сваіх — яны ўжо жылі ў кватэры, на чацвёртым паверсе навюткай грунтоўнай камяніцы, пабудаванай для чыгуначнікаў. Бацька зноў працаваў у складзе брыгады, што клала рэйкі ля Беларускага вакзала. Туды ж узялі і Уладзіка — высачэзны, пад два метры, фізічна моцны і руплівы хлопец быў здатны і да такой дарослай працы.

Сядзіба Друцкіх-Любецкіх у Манькавічах.
З архіва Polonia, з падзякай Кастусю Шыталю



Але ж катаклізмы катаклізмамі, а трэба вучыцца. Увосень 1918 года Дубоўка паступае на гісторыка-філалагічны факультэт МДУ, ды, правучыўшыся два месяцы, кідае вучобу — бацькам зусім складана, трэба працаваць. Ён едзе настаўнікам на Тульшчыну, у вялікае сяло, дзе адвеку жылі суровыя стараверы. Паспрабуй у такой вёсцы ўсталюй новыя парадкі, раздзялі царкву і дзяржаву, патлумач новую рэчаіснасць. Няпроста! Адпраўляючы маладзенькага Дубоўку на месца працы, загадчык аддзела народнай асветы па-бацькоўску папярэджваў: «Пільнуйся, хлопча, становішча надзвычай сур'ёзнае!» Але ж настаўнік для Новай Слабодкі быў незвычайны — пільнаваўся, але не надта. Гнуў сваю лінію. І — выгнуў: «Вучыць вашых дзяцей пісаць і чытаць я буду, і буду бясплатна, такое навучанне аплоціць дзяржава, а за закон боскі грошай мне не даюць, дык звяртай-

цеся ў царкву». Слабажане звярнуліся, але ж мясцовы святар назначыў за навучанне такі высокі кошт, што сяляне пажурыліся-пажурыліся, але ж ці то з эканоміі, ці то са сквапнасці, а можа, і з-за сімпатый да новага настаўніка, маладога і харызматычнага, з новай школай зміріліся.

Адпрацаваўшы год, Дубоўка вяртаецца ў Маскву. Там яго прызываюць у армію ў тэлеграфна-будаўнічую роту: салдаты ўсталёўваюць сувязь у разбітых войнамі гарадах. А ў 1921-м — дэмабілізаваўшыся, але яшчэ ў вайсковай форме — Уладзімір Дубоўка раптам бачыць на Малой Нікіцкай вуліцы шыльду на камяніцы: «Прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе РСФСР».

Ён зойдзе туды спытаць беларускіх газет — і зусім малады бялявы хлопец пакладзе перад ім падшыўку «Савецкай Беларусі». З таго моманту пачнецца сяброўства, а потым і супрацоўніцтва Міхася Мароза, дваццаціпяцігадовага паўнамоцнага прадстаўніка БССР у Маскве, і Уладзіміра Дубоўкі, дваццацігадовага волата, які распачынаў свой пераможны шлях у літаратуру і гісторыю.

Наогул, 1921 год багаты на падзеі. Дубоўка пачынае працаваць у Пастпрэдстве сакратаром, паступае ў славуты Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя Брусава, у гэтым жа годзе ў Мінску выходзіць першы яго верш — «Сонца Беларусі». Крытыка адразу заўважае новае паэтычнае імя і асабліва светлую, бадзёрую танальнасць вершаў. Маладому паэту, які піша па-беларуску ў Маскве, удаецца пазбегнуць адразу двух супрацьлеглых трэндаў у тагачаснай беларускай паэзіі — і рэвалюцыйнай экзальтацыі,



Дубоўка — чырвонаармеец. 1921 год.
З фондаў БДАМЛіМ

і бясконцага ныцця над гаротным жыццём няшчаснай роднай старонкі.

Узлёт маладога Дубоўкі імклівы і несупынны: ён адзін з самых заўважных студэнтаў-брусаўцаў, улюбёнец самога мэтра, Валера Якаўлевіча Брусава, загадчык інстытуцкага кабінета паэтыкі, знаёмец Маякоўскага і Ясеніна, жаданы выступоўца на паэтычных вечарынах і імпрэзах, што ладзяць беларусы ў Маскве, выкладчык Камуністычнага універсітэта і курсаў беларускай мовы… Між іншым, менавіта Дубоўка выкладаў родную мову студыйцам-беларусам пры МХАТ, і адной з самых уважлівых яго вучаніц была маладзенькая Стэфанія Станюта. З 1924 года Дубоўка — супрацоўнік крамлёўскай службы перакладу: гэта ён перакладае на беларускую ўвесь корпус законаў СССР, што прымаюцца ў Маскве. Тут, у кабінеце Крамля, нараджаецца новая беларуская юрыдычная лексіка — талентам аднаго паэта.

**Бездакорнае валоданне заканадаўчай базай (ці дарэмна шэсць гадоў кожную літару закона перакладаў?), ветлівасць і хуткі розум, багаты сялянскі досвед, да таго ж валоданне англійскай мовай. Для богам забытага сібірскага кутка гэта быў сапраўдны скарб**



Дубоўка і ўкраінскі паэт Уладзімір Сасюра. 1925 год.
З фондаў БДАМЛіМ

У 1924-м Дубоўка ўпершыню трапляе ў Мінск. Камандзіроўка найперш службовая: яму дадзена заданне наладзіць у БССР выпуск часопісаў — дзіцячага і настаўніцкага. Тыя часопісы, запачаткаваныя Дубоўкам, жывыя і сёння: «Беларускі піянер», што стаў «Бярозкай», і «Асвета». Але не часопісы тут галоўнае. Галоўнае, што нарэшце паэт знаёміцца са сваім чытачом.

А чытач беларускі Дубоўку хіба што не абагаўляе. Зборнік «Строма», які выйшаў у 1923-м, даўно разабраны на цытаты, кожны выступ у прэсе — падзея, кожнае слова — нагода для абмеркавання. Граюць сваю ролю бясспрэчны, арыгінальны талент, паэтычная смеласць, неардынарнасць мыслення і сталічны, «маскоўскі» флёр (у той час, як і сёння, для беларуса было надзвычай важна, каб свайго прызналі чужыя). На вечарынах, дзе чытае Дубоўка, заўсёды аншлаг, публіка адбівае далоні ў апладысментах.

Вельмі хутка Дубоўка ўваходзіць у жывы мінскі літаратурны працэс. У 1925-м ён старшыня ЦБ «Маладняка», адна за адной выходзяць кніжкі: паэма «Там, дзе кіпарысы», «Калінішчына», зборнік «Трысцё», на пачатку 1926-га — «Credo».

Восьтут і пачынаецца.

Дубоўка вярнуўся ў Маскву з Почату ў 1957-м, у год канчатковай рэабілітацыі па ўсіх сваіх чатырох прысудах. Думаў пераехаць нарэшце ў Беларусь, аднак тут яго не асабліва чакалі

Наогул, 1926 год — няпросты для маладых беларускіх літаратараў. Прыйшоўшы ў літаратуру адразу пасля рэвалюцыі, зусім-зусім маладымі, цяпер яны сталі на крыло: у беларускай паэзіі — вялікая колькасць самабытных, амбітных імёнаў: Міхась Чарот, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Анатоль Вольны, Язэп Пушча, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Пятрусь Броўка. Падцягваецца і моцная, шматабяцальная моладзь: Валер Маракоў, Тодар Кляшторны, Алесь Звонак, Міхась Багун. Вядома ж, пачынаецца надзвычай жорсткая канкурэнтная барацьба, абцяжараная агульнай атмасферай паўсядзённага змагання з ідэалагічнымі ворагамі, уяўнымі і ўмоўнымі. Да таго ж менавіта цяпер, у 1926-м, пасталелыя «рэвалюцыянеры з пялюшак», якія некалі апявалі і блаславілі новы час і новае жыццё, пачынаюць заўважаць вакол сябе не толькі прыгажосць і рамантыку перамен, але і разбуральнасць мацнеючай улады працоўных і сялян. Зборнікі 1926 года, якія выходзяць адны за адным — «І залацісцей і сталёвей» Дудара, «Credo» Дубоўкі, «Vita» Пушчы, нізкі вершаў Янкі Купалы, — прасякнутыя прадчуваннем благіх часоў, трывогай за сябе і краіну, не сфармуляваным яшчэ ў прычынах і следствах, але ўяўным расчараваннем.

Часіна ды з сокам рабіны,
Качаеш мяне ў чарнабыллі…
На дзіды, на вострыі шыпшыннік
Ці сэрца, ці дух мой узбілі…
Калышуцца скаргі і моўкнуць,
Разносяцца разам пялёсткі,
Не хоча Ўладзімер Дубоўка
Спяваць пад зазубраны лёскат…

У траўні 1926-га група паэтаў і празаікаў на чале з Дубоўкам (Адам Бабарэка, Кузьма Чорны, Язэп Пушча, Кандрат Крапіва і іншыя) абвяшчае

## У 1968 годзе здарылася ганебнае: цішком, ані слоўца, Дубоўку выключылі са складу Саюза пісьменнікаў БССР. Нібыта таму, што ён стаяў на ўліку ў Маскве, а не ў Мінску

пра выхад з «Маладняка», пратэстуючы супраць залішняй палітызаванасці мастацтва. Адначасова апазіцыйная група стварае літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша» — сёння мы ўжо ведаем, што менавіта гэтая група акумулявала і развіла тое найлепшае, што было закладзена маладой беларускай літаратурай у першыя паслярэвалюцыйныя гады. З гэтага моманту на старонках цэнтральных газет — «Савецкай Беларусі» і «Звязды» — распачынаюцца бясконцыя жорсткія літаратурна-палітычныя дыскусіі, у якіх былыя таварышы, а цяпер заўзятыя ворагі пляжаць адзін аднаго, не зважаючы на правілы прыстойнасці.

Пасярод гэтай бясконцай бойкі Дубоўка жэніцца. Марыля Пятроўна Кляўс, яго вучаніца — Дубоўка кіраваў беларускімі курсамі ў Беларускім клубе Масквы, дзе займалася Марыля, — з'яўляецца ў жыцці пісьменніка ў складаны час. Марыля была прагрэсіўнай дзяўчынай і доўга супраціўлялася афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу — тады гэта лічылася «перажыткам». Але Дубоўка настаяў. «У далейшым яму гэта спатрэбілася: пры перадачах у турму, пры дазволах на спатканне і г. д.», — пісала потым Марыля Пятроўна. Праз год, у кастрычніку 1928-га, у Дубоўкаў нарадзіўся сын Альгерд.

Ісці супраць плыні для Дубоўкі не навіна. У гэтых складаных варунках (ён нават скарачае свае візіты ў Мінск да мінімуму, а зборнік «Наля» (1927) наогул выходзіць у Маскве, бо Цішка Гартны, адзін з самых жорсткіх ворагаў пісьменніка, абяцае, што ніводнага слова Дубоўкі цяпер не будзе надрукавана ў Беларусі) Дубоўка адчайна змагаецца. Разам з Адамам Бабарэкам і паплечнікамі яны запачаткоўваюць і выдаюць часопіс «Узвышша» — пэўна, найлепшы, найгрунтоўнейшы з «тоўстых» беларускіх літаратурных часопісаў за ўсе часы існавання айчыннай літаратуры. Больш за тое — менавіта «Узвышша» з траўня 1929 года пачынае выходзіць з выкарыстаннем новых літар беларускага алфавіта, створаных Дубоўкам: ён замяніў афрыкаты «дж» і «дз» адмысловымі знакамі, каб падкрэсліць самабытнасць і першараднасць фанетычных беларускіх з'яў у нашай графічнай сістэме. Дубоўка літаральна ходзіць па лязе нажа — у 1927-м у віленскай прэсе друкуецца выразны апазіцыйны верш «За ўсе краі, за ўсе народы свету». Ён апублікаваны пад псеўданімам Янка Крывічанін, але аўтарства Дубоўкі не выклікае ў сучаснікаў сумневаў. У літаратурным беларускім дадатку да маскоўскай газеты «Гудок» ён заяўляе: «З грамадскай працай «Узвышша» і не думала парываць, спадзяючыся праводзіць яе і надалей пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, у магчымых для сябе кірунку і формах — у галіне літаратуры, у формах літаратурна-мастацкіх згуртаваньняў». Гэтае дзёрзкае «у магчымых для сябе кірунку і формах» прагучала як выбух.

З 1929 года за свядомых беларусаў — і найперш за нацыянальную інтэлігенцыю — у БССР бяруцца сур'ёзна. Беларусізацыя імкліва згортваецца, пачынаецца моцны ідэалагічны ўціск. Цяпер на старонках цэнтральных газет, і асабліва «Звязды», адначасова ганяць «і тых, і гэтых»: і былых маладнякоўцаў, і ўпартых узвышаўцаў.

А ў ліпені 1930-га пачынаюцца арышты. «Узвышша» б'юць першым.

Дубоўку арыштавалі проста на працы, у тым самым крамлёўскім кабінеце. Заўсёды франтаваты, стыльна апрануты, ён прыйшоў у той дзень у белым, надзвычай модным, строі.



У 1926-м. З фондаў БДАМЛіМ

## Былыя таварышы, а цяпер зацятыя ворагі пляжаць адзін аднаго, не зважаючы на правілы прыстойнасці. Пасярод гэтай бясконцай бойкі Дубоўка жэніцца

Доўга яшчэ казалі шэптам і ў Маскве, і ў Менску: «Дубоўку ўзялі ў бялізне, проста з пасцелі».

Калі акрэсліць у лічбах далейшыя 28 гадоў яго жыцця, дык выйдзе багаты на судовыя выракі спіс. Большых, чым у Дубоўкі, спісаў не мае ніхто са шматпакутных беларускіх літаратараў.

1930–1931 — пад следствам па справе Саюза вызвалення Беларусі ў Бутырскай, а потым у Мінскай турмах;

1931–1935 — высылка ў Яранску;

1935–1937 — падоўжаная высылка ў Чабаксарах;

1937–1947 — у ГУЛАГу (дзесяць гадоў на лесапавале і будоўлях Бірабіджана);

1947–1949 — часовы адпачынак без дазволу жыць у вялікіх гарадах, Дубоўка працуе рахункаводам у чайным саўгасе ў грузінскім сяле Наразені;

1949–1957 — новы арышт і цяпер ужо вечная высылка ў Краснаярскі край, мястэчка Почат.

* * *

Тут мне хочацца сполахамі, імгненнямі пасярод цемры падсвяціць гэты бясконцы пакутны шлях.

У Яранску, дзе Дубоўка адбываў свой першы тэрмін, яго прынялі на працу юрыстам у райпо. Яно толькі-толькі стварылася, на чале стаяў той, чыёй галоўнай кампетэнцыяй было членства ў Кампартыі — ані гандлю, ані сельскай гаспадаркі ён не ведаў. Праз колькі часу Дубоўка стаў адыгрываць самую заўважную ролю ў гэтай арганізацыі: бездакорнае валоданне заканадаўчай базай (ці дарэмна шэсць гадоў кожную літару закона перакладаў?), ветлівасць і хуткі розум, уменне наладзіць трывалыя чалавечыя кантакты і знайсці выйсце з няпростай сітуацыі, а яшчэ ж і багаты сялянскі досвед, набыты ў складзе вялікай і працалюбівай сям'і ў беларускіх Манькавічах, да таго ж валоданне англійскай мовай (у Яранску і ваколіцах ёй ніхто, вядома ж, не валодаў). Для богам забытага сібірскага кутка гэта быў сапраўдны скарб. Калі Дубоўку праз тры гады пераводзілі з Яранска ў Шэшургу («Ты з глузду з'ехаў, ці што? У цябе ўсім райпо кіруе палітычны высланы?!» — крычалі на старшыню ў мясцовым НКУСе), у Яранску стаялі ўжо парнікі, дзе вырошчваліся адмысловыя, адабраныя Дубоўкам гатункі памідораў і нават кавуны, была арганізаваная вытворчасць колавай мазі, працавалі курсы англійскай мовы і не было ніводнага даўжніка.

Аднойчы бухгалтар Яранскага райпо Іван Хадыкін быў арыштаваны за шкодніцтва. Нешта там не сыходзілася ў справаздачах. Дубоўка тры дні не выходзіў з працы — не хадзіў нават дадому спаць: усё шукаў у паперах і законах ратаванне для калегі. І знайшоў! Хадыкіна вызвалілі, усе абвінавачванні знялі.

Пасля Яранска яго ўжо штурхалі па раёне і асабліва расправіць крылаў не давалі. Перавялі ў Шэшургу, а калі пабачылі, што ён і там хутка атабарыўся — распрацаваў дзялянку, пасадзіў агарод, пачаў рамантаваць халупу, выдзеленую ўладай, —

З Марыляй Кляўс. 1927 год. З фондаў БДАМЛіМ



забралі ў НКУС, трымалі некалькі тыдняў, нічога не гаворачы сям'і, цішком перавялі ў Чабаксары. Там далі нейкую кватэрку, але вельмі хутка дом рассялілі, і Дубоўкам выдзелілі ў якасці часовага жытла хлеўчык, што стаяў у двары. Яго нават закрыць можна было толькі знутры, на кручок. У гэтым хляўчуку з малым Альгердам перажылі сібірскую зіму.

Падчас этапу з Чабаксараў у лагер ахове не спадабалася, што нехта падбег да Дубоўкі з абдымкамі. Спусцілі сабак, але да двухметровага вязня сабакам яшчэ даскочыць трэба. Ён выстаўляў блокам рукі і адбіваўся ад своры. Тады наляцелі самі ахоўнікі, збілі Дубоўку з ног, і сабакам у іх працы выйшла палёгка.

Тыя, хто быў з Дубоўкам у лагеры, успамінаюць, як да яго гарнуліся тыя, хто хацеў застацца чалавекам. Заўсёды знешне спакойны, вельмі пераборлівы і нешматслоўны ў гутарках, надзейны ў працы, Дубоўка ратаваў сябе і іншых ад знялюдзення нечакана: прымушаў, напрыклад, кожную раніцу чысціць зубы. Што б ні было — мыць рукі і чысціць зубы. Проста пасярод гэтага вось усяго.

У 1942 годзе — самы страшны лагерны час, бо з пачаткам вайны фінансаванне ГУЛАГа спынілася і вязні павінны былі самі забяспечваць сябе ежай, — Дубоўка захварэў на пелагру, вельмі распаўсюджанае сярод зняволеных захворванне, якое развіваецца ад голаду і недахопу жыццёва неабходных рэчываў у ежы. Пелагра точыць чалавека доўга, і хварэць на яе, і паміраць ад яе — вельмі пакутна. Дубоўка хварэў два гады — і выкараскаўся, бо не даваў сабе ляжаць. Уставаў з лазарэтнага ложка — і сунуўся або рамантаваць печы, або месці падлогу, або выконваць абавязкі санітара пры ляжачых, каб толькі рухацца.

Алік Дубоўка, адзіны сын, загінуў у 1942 годзе: бегалі з хлопцамі, знайшлі снарад — і кінулі ў вогнішча. Марыля Пятроўна напісала аб гэтым не самому Дубоўку, а доктару лагернага шпіталя. Папрасіла, каб паведамілі толькі тады, калі ён будзе ў сілах атрымаць гэтую вестку. Сама Марыля Пятроўна па Аліку літаральна выплакала вочы — з той пары ўвесь час хварэла і перыядычна губляла зрок. Ды й Дубоўка ўвесь час, успамінаючы Аліка, плакаў.



«Узвышша». 1928 год. З фондаў БДАМЛіМ



Марыля і Алік. 1930-я. З фондаў БДАМЛіМ



8

Фамилия Дубовка Пол

Имя Владимир

Отчество Николаевич

Группа Сектор Алфавит (Заполняется в 1 Спецотделе МВД СССР)

Год рождения 1900. Место рождения Маньковичи Бел.ССР

ПРАВАЯ РУКА

| 1. Большой | 2. Указательный | 3. Средний | 4. Безымянный | 5. Мизинец |
|---|---|---|---|---|

Линия перегиба

ЛЕВАЯ РУКА

| 6. Большой | 7. Указательный | 8. Средний | 9. Безымянный | 10. Мизинец |
|---|---|---|---|---|

Линия перегиба

КОНТРОЛЬНЫЕ ОТТИСКИ

| Левой руки | Правой руки |
|---|---|

Карта заполнена 19 – II – 1949 г. в Тбилиси МГБ (указать где и в каком органе МВД)

Подпись зарегистрированного Дубовка Владимир Николаевич

ПРИМЕЧАНИЕ. В карте должны быть четко заполнены. А. На лицевой стороне:
1. Фамилия, имя, отчество, установочные данные регистрируемого и его подпись.
2. Когда, где, в каком аппарате МВД карта составлена.
3. В квадратиках каждый палец прокатать на своем месте полностью и ясно.
4. В контрольных оттисках левой и правой руки сделать оттиски 4 пальцев каждой руки без большого.
Б. На оборотной стороне:
1. Кем, когда и за что арестован.
2. Кем, когда, за что и на какой срок осужден и сведения о повторных регистрациях.
3. Все данные словесного портрета регистрируемого.
4. Должность и подпись лиц, заполнявших и проверявших карту.

Форма № 2.

Адбіткі пальцаў Уладзіміра Дубоўкі.
З архіва Грузінскага МУС

На партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў рамках віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» прэзентаваны раздзел, прымеркаваны да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі. Яго адкрывае натхнёны расповед паэткі кандыдата філалагічных навук Ірыны Багдановіч пра жыццё і творчасць пісьменніка. Тут жа размешчаны паўнатэкставыя прыжыццёвыя кнігі Уладзіміра Дубоўкі. У адкрытым доступе — матэрыялы даследчыкаў, якія займаліся творчай спадчынай юбіляра: Ірыны Багдановіч, Ганны Севярынец, Віктара Жыбуля, Дзмітрыя Давідоўскага, Васіля Дранько-Майсюка і іншых.

* * *

Дубоўка вярнуўся ў Маскву з Почату ў 1957-м, у год канчатковай рэабілітацыі па ўсіх сваіх чатырох прысудах. Думаў пераехаць нарэшце ў Беларусь, аднак тут яго не асабліва чакалі. Ані з жытлом, ані з лячэннем, ані з працай дапамогі ніхто не прапаноўваў, да таго ж адносіны да былога ворага народа былі, мягка кажучы, насцярожанымі. Пра што казаць: калі ў 1960 годзе ў зале Дома літаратара адзначалі юбілей Дубоўкі (усім Домам адзначалі — нельга было абысці), адразу пасля афіцыйнай імпрэзы ўсе госці шусь — і разбегліся, і ён стаяў ля ўваходу адзін, агромністы, высачэзны, з даўгой сівой барадой, кінуты ўсімі. Тады да яго падышоў толькі Юльян Пшыркоў, літаратуразнавец, што першым вяртаў імёны міжваенных паэтаў і празаікаў у навуковы зварот. Падышоў, прапанаваў пайсці да яго. З сям'ёй Пшырковых Дубоўка сябраваў да канца жыцця.

У 1968 годзе наогул здарылася ганебнае: ціхком, ані слоўца, Дубоўку выключылі са складу Саюза пісьменнікаў БССР. Ён аб гэтым даведаўся значна пазней. Нібыта таму, што ён стаяў на ўліку ў Маскве, а не ў Мінску.

Між тым — Дубоўка ў беларускую літаратуру вярнуўся. Гэта адзіны ў свеце выпадак — каб пасля 28 гадоў маўчання літаратар вярнуўся ў жывы літаратурны працэс, і не ганаровым пенсіянерам, што перавыдае свае маладыя тэксты, а форвардам. Ён першы і пакуль адзіны, хто пераклаў на беларускую мову ўвесь корпус санетаў Шэкспіра. Менавіта ў шасцідзясятыя пісьменнік распачаў і распрацаваў незвычайны жанр дыдактычнай прозы, сабраў і пераказаў у вершах незлічоную колькасць народных казак для дзяцей. У 1962 годзе быў ганараваны прэміяй імя Янкі Купалы за кнігу вершаў «Палеская рапсодыя».

Уладзімір Дубоўка памёр нечакана. У сакавіку 1976-га пайшоў у аптэку за лекамі для хворай Марылі Пятроўны, паслізнуўся на дзіцячай пляцоўцы ў двары свайго дома — і зламаў шыйку бядра. Даў згоду на аперацыю, але яе не пеҏажыў: адарваўся тромб. Доктар потым казаў Марылі Пятроўне: нягледзячы на тое, што на сэрцы Дубоўкі было два рубцы ад інфарктаў, перанесеных на нагах, каб не аперацыя, мог яшчэ доўга жыць, бо сілы меў невымерныя.